творчестве архитекторов Беларуси рубежа XX–XXI веков – В. Чайковского, А. Андреюка, А. Цейтлина, В. Галковского, Т. Лобинской, Л. Мельцера и др. Идеи классики можно проследить и в попытках воплотить архитектурными формами идеологию государства – в административных зданиях 1970–1980-х годов, а также в крупнейших знаковых постройках последних десятилетий – Дворце Республики и Дворце Независимости, апеллирующих к универсальной схеме классического периптера. Классический прототип, трансформированный в монументальных объемах гипертрофированного масштаба зданий, использован здесь в качестве универсальной схемы, репрезентируя идею государственности, облекая классический принцип устремленности к единому центру в идеологическую формулу.

*Заключение.* Многогранные проявления классики в современной архитектуре подтверждают тезис о том, что это живая развивающаяся система, способная интегрироваться в любой социокультурный контекст, выражать разнообразные смыслы и идеалы. Принципы и художественные средства классической архитектуры оказываются созвучными разным идеологическим установкам и художественным задачам – разнообразные модели Универсума, ориентированные на единый духовный центр, аллюзии преемственности с разными пластами истории архитектуры, использование ордерной системы и ее элементов. Апеллирование к классике и ордеру в различные эпохи и в различных художественных системах является одним из условий культурной преемственности эпох, сохранения идентичности профессионального творчества зодчего.

*Литература*

1. *Бычков, В. Хронотипология неклассических форм художественно-эстетического сознания / В. Бычков, Н. Маньковская // Искусствознание. – 2008. – № 4.– С. 83.*
2. *Зедльмайр Г. Искусство и истина: Теория и метод истории искусства / Г. Зедльмайр // Пер. с нем. Ю.Н. Попова. – СПб.: Axiota, 2000. – С. 126.*
3. *Ревзин, Г. Архитектурная апофатика / Г. Ревзин // Проект Классика. –2003. – № 9. – С. 60.*
4. *Жолтовский, И.В. Принцип зодчества / И.В. Жолтовский. – Архитектура СССР. – 1933. – № 5. – С. 9.*
5. *Кавтарадзе, С. Анатомия архитектуры. Семь книг о логике, форме и смысле / С. Кавтарадзе. – М.: Издательский Дом ВШЭ, 2015. – С. 41.*

**IDEAS OF CLASSICS IN MODERN ARCHITECTURAL FORMATION**

**Ala Shamruk**
**Doctor of arts, Center for Research of the Belarusian Culture, Language and Literature at the National Academy of Sciences of Belarus**

The article analyzes the ways of developing classical ideas in modern architecture, characteristic categories and properties of works that are oriented towards classical ideals. Attention is focused on the categories of harmony and metaphysical senses that underlie the design strategies for the development of the spirit of the classics in modern architecture. The embodiment of classical ideas and principles is considered on the example of world and domestic practice.

*Поступила в редакцию 27.12.2017 г.*

УДК 72.071.1(476)(092)

# ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ НЕАКЛАСІЧНАГА НАПРАМКУ Ў БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ АРХІТЭКТУРЫ І РОЛЯ І. ЖАЛТОЎСКАГА

**Марозаў Я.В.**
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры «Дызайн архітэктурнага асяроддзя»
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

*У артыкуле прасочаны творчы лёс архітэктара Івана (Яна) Жалтоўскага, пададзены невядомыя факты яго біяграфіі. Аўтар вылучае асноўныя плыні развіцця неакласічнага напрамку на прыкладах з тагачаснай беларускай архітэктурнай практыкі, суадносіць іх з лёсам асобных майстроў.*

*Уводзіны.* Неакласічная архітэктура савецкага часу з'яўляецца сёння візітоўкай не толькі Мінску, але і ўсёй

нашай краіны. Культурнае значэнне архітэктуры гэтага перыяду даследуецца, але бадай што ніводным навукоўцам не аспрэчваецца. Аб нацыянальным прызнанні яе высокіх мастацкіх дасягненняў сведчыць і любоў да яе гараджан, і, нават, факт, што большасць пабудоў таго перыяду ўжо сёння ўнесеныя ў Спіс нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцяў і ахоўваюцца дзяржавай.

Выключная роля ў фарміраванні архітэктурнай неакласічнай школы належыць Івану Жалтоўскаму, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР, РСФСР, лаўрэату Сталінскай прэміі. Большасць архітэктараў-неакласікаў, у тым ліку і галоўны архітэктар праспекта ў Мінску М. Паруснікаў, лічылі сябе вучнямі гэтага майстра. І. Жалтоўскі амаль усё свае доўгае жыццё выкладаў, займаўся настаўніцтвам і ў сценах вучэбных устаноў, і ў майстэрнях, што ўзначальваў. І. Жалтоўскі змог перанесці архітэктурны вопыт антычнасці і Адраджэння ў сучасную яму тэорыю і практыку, ён не толькі зрабіў пераклад і выдаў кнігі Антоніо Паладзіо, але і запраектаваў шэраг знакавых пабудоў, у значнай ступені стварыў савецкую школу неакласікі.

Сёння творчасць І. Жалтоўскага разглядаецца ў межах расійскай архітэктуры, у сучасную беларускую культуру ён унесены толькі як славуты зямляк. Задача суаднесці творчы лёс майстра з тагачаснай беларускай архітэктурнай практыкай, адзначыць яго ролю ў фарміраванні неакласічнага напрамку ў міжваеннай беларускай архітэктуры ставіцца ў даследаванні ўпершыню.

*Асноўная частка.* Іван (Ян) Жалтоўскі нарадзіўся ў шляхецкай сям'і ў маёнтку Бродча, што знаходзіцца ў сёняшнім Столінскім раёне, ў 1867 г. Па ўспамінах сялян, пан (бацька будучага архітэктара) быў небагаты, меў дзесяць сямей прыгонных сялян, а пасля рэформы выдзяліў ім па 30 дзесяцін і не пазней 1885 года распрадаў рэшту зямлі [1, с. 176]. Цікава, што Жалтоўскі, які па ўспамінах сучаснікаў быў выдатным настаўнікам, у дзяцінстве не надта добра вучыўся. Гімназію ён скончыў з нізкім балам, ні ў рэальным вучылішчы, ні ў Акадэміі мастацтваў выпускнога дыплома так і не атрымаў [2]. Вучоба ў Пецярбургу доўжылася 11 год, будучы майстар хутчэй за ўсё вымушаны быў сумяшчаць навуку з працай. Вядома, што ён працаваў у якасці памочніка архітэктара. Гэтая, а, мажліва, і іншая менш кваліфікаваная работа, дапамаглі яму пазнаёміцца з працай будаўнікоў, з будаўнічымі матэрыяламі, зразумець крытэры прыгажосці простых майстроў, таямніцы штукарства. У сваіх выступах ён заўсёды адзначаў, што праца на будоўлях – гэта неабходная частка адукацыі будучага архітэктара [3, с. 35]. Пасля Пецярбургу Жалтоўскі пераязжае ў Маскву, тут ён выкладае ў Строганаўскім вучылішчы і знаходзіць свае кола замоўцаў – заможных купцоў-старавераў. Аўтарытэт Жалтоўскага быў высокі і сярод калег, што пацвярджаецца прысваеннем яму звання акадэміка, хоць колькасць рэалізаваных работ была ў яго на тот час адносна малая [2]. З набыццём улады бальшавікамі, майстар выходзіць ў першае кола, становіцца творчым кіраўніком Архітэктурнай майстэрні Моссавета, загадчыкам Архітэктурна-мастацкага аддзела Наркампроса. Ён праектуе і кіруе будоўляй Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выставы ў Маскве – варта думаць, самай крупнай архітэктурнай рэалізацыяй тых гадоў. У 1923 годзе майстар на тры гады выязджае ў Італію.

28 лютага 1932 г. была прынята пастанова Савета будаўніцтва Палаца Саветаў пры Прэзідыуме ЦВК СССР "Аб арганізацыі работ па канчатковым састаўленні праекта Палаца Саветаў СССР у горадзе Маскве". Шмат якія даследчыкі лічаць гэты момант паваротным у лёсе савецкай архітэктуры. Партыйны курс на выкарыстанне "як новых, так і лепшых прыкладаў класічнай

архітэктуры“ [4, с. 16] трактаваўся як асваенне спадчыны класічнай ордэрнай архітэктуры. Пераважная большасць праекціроўшчыкаў на той час атрымала адукацыю ў рэчышчы класічнага авангарду і, згодна з методыкай архітэктурный адукацыі тых год, не мела ніякага ўяўлення пра гісторыю архітэктурных стыляў. Запатрабаванай стала месца галоўнага захавальніка спадчыны і майстра-настаўніка, на якое і трапіў І. Жалтоўскі, які вярнуўся з Італіі самым дасведчаным знаўцам гісторыі класічных стыляў, быў вядомым майстрам у колах архітэктараў і партыйнай эліты.

Але гэта спрошчаная карціна, насамрэч за шэрагам адміністрацыйных рашэнняў і збегам акалічнасцей стаяла шмат рознаскіраваных працэсаў. Вядома, дырэктывы і пастанаўленні выраблялісі ў Маскве, але лакальная беларуская архітэктурная практыка 1930-х г. бачыцца не менш вартаснай. Яе пільнае вывучэнне прыводзіць нас да высноваў, што можна вылучыць не толькі дырэктыўную, але і ўнутрыпрафесійную, і сацыяльную логіку развіцця неакласічнага накірунку ў беларускай архітэктуры.

У беларускай архітэктуры адыход ад авангарду пачаўся раней, чым сталі вядомыя вынікі конкурсу на праект пабудовы Палаца Саветаў у Маскве. Конкурс праектаў Дома Ураду БССР адбыўся ў 1929 г. і скончыўся паражэннем архітэктараў авангардыскага кірунку. Цікава, што прыняты да рэалізацыі варыянт Іосіфа Лангбарда, ў меншай ступені ўлічваў гарадскі кантэкст у адрозненні ад іншых асіметрычных праектаў, упісаных у складаную геаметрыю пляца забудовы. І. Лангбард прапанаваў сіметрычы будынак, што ўтвараў курданёр на ўзор класічных палацавых ансамбляў. Кампазіцыя будынку нагадвала піраміду – архітэктурны знак улады яшчэ з часоў мастаб Егіпту і зіккуратаў Міжрэчча. Выгляд будынку быў пазбаўлены тыпова класічнага дэкору, портыкаў і капітэляў, што часта трактавалася як рыса канструктывізму і сапраўды было данінай як архітэктурай модзе, так і стану будаўнічай прамысловасці тых гадоў. Але тут знакавыя элементы канструктывізму па-мастацку інтэрпрэтаваны: вокнам нададзеныя класічныя прапорцыі, лесвічныя маршы вертыкальна падзяляюць галоўны фасад конкурснага варыянта, як чатыры калоны класічнага порціка. Цікава, што лёс Лангбарда шмат ў чым сугучны з лёсам Жалтоўскага. Абодва архітэктары вучыліся ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў, абодва пачалі сваю практыку яшчэ да 1917 г. Гэтых майстраў збліжае і тое, што яны мелі вялікую практыку кіравання працамі на будоўлях і сфарміравалі свае ўласныя архітэктурныя погляды, абапіраючыся на практычны досвед.

1930-я гг. у беларускай архітэктуры былі адзначаныя з’яўленнем цэлага шэрагу авангадных пабудоў, цалкам пазбаўленых архітэктурнага дэкору. Але, відавочна, настроі ў грамадстве змяняліся, аскетычны знешні выгляд ужо не задавальняў густы прадстаўнікоў савецкага бюракратычнага апарата. Асабліва цікавыя спробы ўзбагаціць фасады дамоў, не завяртаючыся да класічнай спадчыны. Так у Трэцім доме Саветаў у Мінску (вул. Багдановіча, 52/21) фасады, што выходзяць на скрыжаванне вуліц, аздоблены вертыкальнымі нішамі, на якіх нечакана выкарыстана фактура колатага граніту. Напэўна, можна звязаць такі прыем з традыцыямі архітэктуры мадэрну, якую змог прыўнесці ў аздабленне будынку адзін з яго архітэктараў Аляксей Дзянісаў – майстар, што пачаў сваю практыку пасля сканчэння вучэльні, яшчэ ў 1906 г.

Савецкая архітэктура не развівалася адасоблена ад еўрапейскіх і заходнеамерыканскіх уплываў. Дэкаратыўныя матывы ар-дэко можна разгледзець ўжо ва ўзгаданым вышэй будынку Дома Урада ў Мінску. Часткова такі прыём быў канструктыўна абумоўлены выкарыстаннем няпоўнага каркасу, калі ўнутры будынка калоны

пакінулі, а вонкавыя рады іх замянялі на сцены, але нават сам Лангбард звязваў гэты прыём з патрабаваннямі эстэтыкі. Вертыкальныя элементы, згодна з яго бачаннем, увасаблялі жыццё, бадзёрасць і моц, а гарызантальныя ён атаясамліваў са сном, ці са смерцю. [5, с. 40]. Апроч пабудоў І. Лангбарда, манументальныя рысы стылю ар-дэко мы можам прасачыць і ў творах іншых беларускіх архітэктараў. У праекце Дома Радыё ў Мінску [6] архітэктары А. Воінаў, А.Крылоў, Н. Макляцова і М. Салін стварылі выразную пірамідальную кампазіцыю з выкарыстаннем пілонаў і пілястр (мал. 1). Цэнтральны элемент кампазіцыі – вежа, якая па сваёй шырыні наўрад ці можа выкарыстоўвацца іначай як радыёмашта, бо для размяшчэння памяшканняў ліфтоў і лесвіц ў ёй не хапае месца. З’яўленне яе – гэта, хутчэй за ўсё, даніна модзе, што захапіла ў той час не толькі Амерыку, але і Еўропу. У дэкоры гэтага будынку няма яскравых атрыбутаў нейкага гістарычнага стылю, нішы і лапаткі ствараюць тут своеасаблівы геаметрычны малюнак, што набліжае будынак да ар-дэко і да пошукаў стылістыкі ў савецкай архітэктуры тых часоў, якія даследчыкі акрэсліваюць як “школа Іафана”, ці як “пілонна-лапатачны стыль”.

У беларускай архітэктуры 1930-х гг. няшмат прыкладаў выкарыстання калон у класічным ордэрным выглядзе: іх замянялі на прамавугольныя слупы, змянялі прапорцыі, спрошчвалі форму баз і капітэляў. Такі падыход тлумачыўся ўплывам прынцыпаў архітэктурнага авангарду, што адмаўлялі прамое капіраванне класічных дэталяў. Так І. Лангбард, што атрымаў выдатную адукацыю ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў і памайстэрску валодаў мовай класічнай архітэктуры, выкарыстаў у аздабленні фасадаў Дома Чырвонай арміі класічныя дэкаратыўныя прыёмы, але ж у яго няма ніводнай дэталі, дакладна скапіраванай з антычных узораў (мал. 2). Класічны ордэр пераасэнсаваны, трохі спрошчаны і па-мастацку акрэслівае нязвыклыя для класікі, складаныя па форме і аб’ёме басейн і сцэнічную каробку зала.



Мал. 1. Дом Радыё ў Мінску. Праект А. Воінава, А. Крылова, Н. Макляцовай, М. Саліна (1930-я г.). – Дзяржаўны навукова-даследчы музэй архітэктуры ім. Шчусева (Масква). Адз. зах. Р/А 4495



Мал. 2. Дом Чырвонай арміі (Дом афіцэраў) у Мінску (вул. Чырвонаармейская, 3; 1934–1939 гг.). Дэталь фасада. – Фотаздымак аўтара

Такая адвольная трактоўка архітэктурнага ордэру выглядала гарманічна не ва ўсіх архітэктараў. Жылы дом Горсавету ў Мінску (пр. Незалежнасці, 43) быў раскрытыкаваны як ілжывы накірунак у “засваенні класічнай спадчыны”

[7, с. 50-51] яшчэ ў часы свайго будаўніцтва. Будынак мае складаны план, утварае курданёр. Фасады дэкараваны даволі сціпла, адзінае, што адразу кідаецца ў вочы, – гэта велізарныя паўкалоны, якія ідуць ад ніжняй рустованай часткі фасада на вышыню трох паверхаў і афармляюць вуглавыя часткі будынка, якія выдаюцца ў бок праспекту (мал. 3). Калоны маюць прапарцыянальна малыя капітэлі, злучаныя са ствалом калоны праз невялікае завужанне. Форма капітэляў даволі нетыповая, пляскатая. У цэлым аб’ёме будынку няма адзінства: тут выкарыстаныя паўкалоны і калоны розных прапорцый, часам увогуле без капітэляў. Хутчэй за ўсё гэта было выклікана адсутнасцю класічнай падрыхтоўкі ў аўтара гэтага будынка Г. Якушкі. Але ён быў прафесійным архітэктарам, пабудаваў шмат яскравых канструктывісцкіх аб’ектаў, з 1936 па 1941 год працаваў галоўным архітэктарам Мінску. Вядома, што ён вучыўся ў Ленінградскім інстытуце грамадзянскіх інжэнераў з 1918 па 1924 год, і менавіта трапіў у плынь канструктывісцкай архітэктуры не атртымаўшы класічнай школы.



Мал. 3. Жылы дом Горсавету ў Мінску (пр. Незалежнасці, 43).
Дэталь фасада. – Фотаздымак аўтара



Мал. 4. Будынак партыйных курсаў ў Мінску (вучэбны корпус БДУ) (ул. К. Маркса, 31; 1934–1937 гг.). Фотография 1940 г. – Мінск незнаёмы 1920 – 1940 / аўтар-укладальнік І.М. Куркоў. – Мінск: Ураджай, 2002. – С. 107

Будынак партыйных курсаў ў Мінску (вул. К. Маркса, 31) пабудаваны ў сярэдзіне 1930-х гг. па праекту А. Воінава, дайшоў да нашага часу практычна без зменаў і нават захаваў сваю арыгінальную каларыстыку (мал. 4). Вулічны фасад мае два сіметрычныя крылы, пра тым, што план будынка неадпаведна больш складаны, развіты ўглыб квартала. Фасад гарызантальна падзелены на тры часткі пры дапамозе нязначна высунутых карнізаў простай формы. Ніжняя, цокальная, расчэрчана на блокі, верхняя – аздоблена квадратнымі вокнамі з простымі рамкамі-ліштвамі. Сярэдняя частка вертыкальна падзелена пры дапамозе падвойных паўкалон і вітражоў вышынёй ў тры паверхі. Паўкалоны ўспрымаюцца не як класічны ордэр, а разам з усёй паверхняй гэтай часткі фасада, не вылучаючыся як паасобныя элементы. Вітражы, што сіметрычна былі пастаўлены па чатыры на бакавых крылах, прытоплены ўглыб сцяны і хавалі за сабой паэтажныя вокны. Сёння гэтыя цікавыя элементы страчаныя і замененыя на звычайныя вокны. Разглядаючы першапачатковы выгляд, дзівішся таму, як трапна спалучаліся класічная сіметрычная схема кампаноўкі фасада, відазмененыя ліштвы, карнізы і паўкалоны з мадэрністычным прыёмам кампаноўкі фасада як фармальнай кампазіцыі з розных

плашчызн: вітража, сцен рознай фактуры. Менавіта ў гэтым будынку ўвасобіліся тыя рысы, што сёння дазваляюць нам вылучаць беларускую школу "безордэрнай манументальнасці". Тое, што стрыманасць формаў, выкарыстанне спрошчаных класічных дэталяў, характэрныя для пабудоў І. Лангбарда, А. Воінава і шэрагу іншых архітэктараў, былі "адрозныя ад архітэктуры іншых раёнаў СССР, дзе ў тыя часы звярнуліся да класічных формаў" [8, с. 17], адзначалі яшчэ савецкія даследчыкі.

Напрыканцы 1930-х гг. у беларускай архітэктуры з'явіліся пабудовы, ў якіх можна прасачыць больш кананічныя дэталі, дакладней – скапіраваныя з помнікаў Антычнасці і Рэнесансу. Расійскі даследчык А. Іконнікаў акрэслівае такі падыход як "маскоўскую школу", што гуртавалася вакол І. Жалтоўскага [9, с. 427]. Адной з першых пабудоў, якія наблізілася да цытавання класікі, можна лічыць Тэатр юнага гледача ў Мінску (вул. Энгельса 26, 24/14). Першапачаткова ён узводзіўся як клуб будаўнікоў і меў авангардны характар. У 1936 годзе перад У. Вараксіным і А. Воінавым кіраўніцтва паставіла задачу перапрацаваць праект згодна са зменай савецкай стылістыкі. Галоўны ўваход атрымаў шасцікалонны порцік, фасады былі аздобленыя пілястрамі. Ордэр выглядае вельмі набліжаным да класічных аналагаў, але, напэўна, аўтары, выхаванныя ў традыцыях авангарду, яшчэ не могуць сабе дазволіць поўнае капіраванне карынфскага ордэру, а, як адзначалася, "працуючы над вобразам калонны … удала ўвялі ў капітэль языкі полымя піянерскага вогнішча" [8, с. 47].

Будынак педагагічнага інстытута ў Гомелі (вул. Савецкая, 101), скончаны ў 1936 г., багата аздоблены класічнымі дэталямі (мал. 5). Можна заўважыць, што дэкор цэнтральнай часткі і фасад знакамітага жылога дома на Махавой вуліцы ў Маскве, што пабудаваны І.Жалтоўскім у 1933–1934 гг., знанага як "цвік у труну канструктывізму" маюць адзіную крыніцу натхнення – рэнесансны фасад Палаццо дель Капітаніё. Цікава, што гомельскі аналаг мае менш паверхаў у адрозненні ад маскоўскага дома Жалтоўскага, і гэта дазволіла невядомаму архітэктару зрабіць больш дакладную копію італьянскага аналагу.



Мал. 5. Будынак педагагічнага інстытута ў Гомелі (вул. Савецкая, 101; 1936 г.).
Агульны выгляд. – Фотаздымак аўтара

Прыкладам выкарыстання класічнага порціка з трохвугольным франтонам з'яўляецца будынак кінатэатра "Радзіма" ў Магілёве, што быў пабудаваны архітэктарам У. Вараксіным у 1939 г. (мал. 6). Аднак і тут не вытрыманыя класічныя прапорцыі: калоны, пастаўленыя надта далёка адна ад адной, да таго ж паміж дзвюма сярэднімі – інтэрвал значна большы, чым у астатніх. Напэўна, каб зрокава кампенсаваць гэты памер, архітэктар змяніў іх знешні выгляд, пашырыўшы ніжнюю частку і надаўшы ёй форму куба. Беларускі даследчык А.А. Воінаў адзначаў, што гэты будынак "з'яўляецца адным з нешматлікіх прыкладаў выкарыстання гатовых форм классічнай спадчыны" [8, с. 48].

Драматычны тэатр у Гомелі пабудаваны ўжо пасля Другой сусветнай вайны, аднак праекаванне яго было пачата яшчэ ў 1941 г. архітэктарам А. Тарасенка (мал. 7). Вядома, што кансультантам праекту быў І. Жалтоўскі, і гэта, безумоўна, вызначыла высокі ўзровень адпаведнасці класічным узорам. Можна лічыць, што гэты будынак

адзначае заканчэнне фарміравання неакласічнага накірунку ў беларускай савецкай архітэктуры.



Мал. 6. Будынак кінатэатра "Радзіма" ў Магілёве (1939 г.). Агульны выгляд. – Фотаздымак аўтара



Мал. 7. Драматычны тэатр у Гомелі (1941–1956 гг.). Агульны выгляд. – Фотаздымак аўтара

*Заключэнне.* У часы другой сусветнай вайны беларуская архітэктура панесла каласальныя страты. Падчас пасляваеннага аднаўлення ў краіну прыехала шмат архітэктараў з Расіі, якія засвоілі архітэктурную школу І. Жалтоўскага. Такім чынам, уплыў нашага славутага земляка на беларускую архітэктуру стаў, без перабольшання, вызначальным. Аднак ёсць і ў Беларусі будынак, выкананы згодна з праектам мэтра: гэта надбудаваная вежа манастыра францішканцаў ў Пінску. Праект хутчэй за ўсё быў выкананы ў 1912 г., а рэалізаваны толькі ў 1923–1924 гг. пасля пажару [10], калі Пінск і Заходняя Беларусь знаходзіліся ў складзе Другой Рэчы Паспалітай.

*Літаратура*

*1. Вярэніч, В.Л. Палескі архіў / В.Л. Вярэніч – Мінск : Выдавец ІП Вараксін, 2009. – 692 с.*

*2. Шурыгина, О.С. Новые данные к биографии И.В. Жолтовского (к 150-летию со дня рождения архитектора) [Видеозапись]. Конференция "Наследие архитектуры России" 31 октября – 2 ноября 2016 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=IMAOfHabxgE. Дата доступа: 3.09.2017.*

*3. Мастера советской архитектуры об архитектуре. Избр. отрывки из писем, статей, выступлений и трактатов: в 2-х т. / Под общ. Ред. М. Бархина [и др.]. – М : Искусство, 1975. – Т 1. – 1975 г. – 544 с.*

*4. Итоги величайшего архитектурного конкурса. О результатах работ по Всесоюзному открытому конкурсу на составление проекта Дворца советов СССР в Москве/ Совет строительства по сооружению Дворца советов при Президиуме ЦИК СССР // Строительство Москвы. – 1932. – № 3. – С. 16.*

*5. Воинов, А. А. И. Г. Лангбард: Творческий путь / А. А. Воинов. – Минск: Выш. школа, 1976. – 272 с.*

*6. Дом радио. Воинов, Маклецова, Салин. // Государственный научно-исследовательский музей архитектуры им. Щусева. – Ед. хр. Р/А 4495.*

*7. Далин, А. Архитектура / А. Далин // Очерки по истории изобразительного искусства Белоруссии / А. Далин [и др.]. – М. – Ленинград: Гос. изд. «Искусство», 1940. – С. 38–53.*

*8. Воинов, А. А. История архитектуры Белоруссии: Советский период: Учеб. пособие / А. А. Воинов, науч ред. В. А. Чантурия. – Минск: Выш. шк., 1975. – 217 с.*

*9. Иконников, А. В. Архитектура XX века: Утопии и реальность: В 2 т. / А. В. Иконников. – М.: Прогресс-Традиция, 2001. – Т. 1. – 654 с.*

*10. Харевский, С. Иван Жолтовский. Культовый зодчий из Пинска / С.Харевский // Хата бай [Электронный ресурс]. – 2012. Режим доступа : https://www.hata.by/architecture/ivan_zholtovskij_kultovyj_zodchij_iz_pinska-5153/. – Дата доступа 3.09.2017.*

**THE NEOCLASSICAL TRENDS IN SOVIET BELORUSSIAN ARCHITECTURE AND THE IMPLICATION OF I. ZHOLTOVSKY**

**E. Morozow**
**PhD, associate professor of the Department of Architectural Environment Design, BNTU**

In the article the creative life of Ivan (Jan) Zholtovski is observed and the new biographical facts are shown. The author identifies mail trends in neoclassical architecture and expose them on biographical facts and architectural details.

*Поступила в редакцию 15.01.2018 г.*